# СЛЫННЫ СЫН ЗЯМЛІ БЕЛАРУСКАЙ

## (ЗАМЕСТ ПРАДМОВЫ)

***Ігнатовіч П. Р.**, прафесар*

*Узяўшы ў рукі ясны ліхтарык, павінны мы крок за крокам абыйсці мінулае нашай Бацькаўшчыны. І ніводзін куточак нашага многапакутнага жыцця ня можа і не павінен астацца без нашага стараннага агляду.*

(Ігнатоўскі У. М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. Мн., 1991. С. 23)

Паважаны чытач, ты трымаеш у руках кнігу, якая нарадзілася ў сувязі са знамянальнай датай — 125-й гадавінай з дня нараджэння волата зямлі беларускай, буйнага мысліцеля, навукоўца, удумлівага і мудрага арганізатара беларускай навукі і адукацыі, вядомага беларускага гісторыка, дзяржаўнага і грамадскага дзеяча Усевалада Макаравіча Ігнатоўскага.

Лёс гэтага чалавека быў шчаслівым і трагічным адначасова. Выхадзец з беларускай глыбінкі, будучы таленавітым, удумлівым і няўрымслівым у справах сваіх, шукаў свой шлях і лёс. Свой шлях ён заўсёды звязваў з лёсам і шляхам свайго народа. З юных гадоў ён горача ўспрымаў праблемы свайго народа. Гэта прывяло яго да рэвалюцыйнай дзейнасці. Ён марыў бачыць свой народ свабодным і шчаслівым, а сваю краіну — квітнеючай, з развітай культурай і адукацыяй.

Шлях яго ні ў жыцці, ні ў рэвалюцыі не быў ні прамым, ні беспраблемным. Ён шукаў сваё месца, часам шарахаўся.

Яго непрацяглае, але вельмі насычанае жыццё яскрава адлюстравала тую складаную эпоху, ў якую яму давялося жыць, працаваць, змагацца.

Нарадзіўся У. М. Ігнатоўскі 19 красавіка 1881 г. у вёсцы Такары Брэсцкага павета (зараз Камянецкі раён) Брэсцкай вобласці ў сям'і народнага настаўніка. Пазней бацька стаў святаром Быценскай Петрапалаўскай царквы. Усевалад Ігнатоўскі вучыўся ў Віленскай духоўнай семінарыі, з якой быў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выключаны за ўдзел у рэвалюцыйных выступленнях моладзі. Працягваў вучобу ён ужо ў Магілеўскай семінарыі, якую скончыў у 1902 г. Тыя факты, што бацька У. Ігнатоўскага быў служыцелем культу і ён сам атрымаў духоўную адукацыю, потым ставіліся яму ў віну. Тым не менш царкоўнай асобай ён не стаў. Каб атрымаць вышэйшую адукацыю, Ігнатоўскі паступіў на гісторыка-філалагічны факультэт Пецярбургскага універсітэта, скончыць які яму аднак не ўдалося. У 1905 г. ён быў арыштаваны і высланы з сталіцы Расійскай Імперыі на радзіму. У канцы 1906 г. яму было дазволена вярнуцца ў Пецярбург і наведваць лекцыі. Аднак працягвалася гэта нядоўга. Праз кароткі час У. Ігнатоўскі быў выключаны з універсітэта і высланы з Пецярбурга на поўнач, у Аланецкую губерню. Пасля адбыцця ссылкі яму было забаронена жыць у пяці буйнейшых гарадах Расіі, вядома ж быў закрыты шлях і ў сцены універсітэтаў гэтых гарадоў. Але неадольная прага да ведаў, неверагодная настойлівасць і працавітасць дазволілі яму ў 1908 г. паступіць у Юр'еўскі (зараз Тартускі) універсітэт, які ён паспяхова скончыў у 1911 г.

Пасля заканчэння універсітэта У. Ігнатоўскі працаваў у Вільні ў прыватнай гімназіі. Калі ў Мінску адкрыўся настаўніцкі інстытут, ён быў прызначаны туды ў 1915 г. выкладчыкам гісторыі, а пасля стаў і старшынёй педагагічнага савета. З 1915 па 1920 г. быў выкладчыкам, а потым прафесарам Мінскага настаўніцкага (з 1919 г. — педагагічнага) інстытута.

У грозныя рэвалюцыйныя часы прымаў актыўны ўдзел у рэвалюцыйных падзеях. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі стаяў на платформе левых эсэраў. Падчас польскай акупацыі большай часткі тэрыторыі Беларусі ў 1919—1920 гг. У. Ігнатоўскі вёў падпольную барацьбу супраць польскіх акупантаў, узначальваючы арганізацыю «Маладая Беларусь», якая з'яўлялася левай плынню партыі беларускіх эсэраў. У снежні 1919 г. па яго ініцыятыве гэта арганізацыя адкалолася ад партыі беларускіх сацыялістаў-рэвалюцыянераў і быў створаны ў Мінску арганізацыйны цэнтр Беларускай камуністычнай арганізацыі (БКА). У лютым 1920 г. на нарадзе прадстаўнікоў падпольных груп



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

быў абраны ЦК БКА на чале са старшынёй У. М. Ігнатоўскім. 30 ліпеня 1920 г. У. М. Ігнатоўскі быў прыняты ў члены РКП(б), а ў жніўні 1920 г. уся Беларуская Камуністычная арганізацыя па яе просьбе была прынята ў склад Кампартыі бальшавікоў Літвы і Беларусі (праз некаторы час — Кампартыя бальшавікоў Беларусі), якая ўваходзіла ў склад РКП(б).

Найбольш ярка талент У. М. Ігнатўскага раскрыўся ў 20-я гг. XX ст. Непрацяглы час у 1920—1921 гг. ён працаваў наркомам земляробства. З 1921 г. уся яго ўвага была сканцэнтравана на будаўніцтве нацыянальнай адукацыі і навукі. У гэтым жа годзе ён назначаецца народным камісарам асветы рэспублікі. Нам сёння цяжка ўявіць стан, у якім знаходзіліся праблемы адукацыі і асветы ў той час. А яны былі вельмі складанымі. Амаль адсутнічалі навучальныя ўстановы, непісьменнасць насельніцтва, адсутнасць нацыянальных кадраў. Сярод галоўных задач народнага камісара асветы — ліквідацыя непісьменнасці, стварэнне вышэйшай школы — падмурка беларускай навукі і культуры.

Вось некалькі штрыхоў яго дзейнасці. У. М. Ігнатоўскі вядзе крапатлівую работу па пошуках і запрашэнню ў рэспубліку навуковых кадраў — выхадцаў з беларускіх земляў, раскіданых лёсам (у тым ліку і войнамі) па свеце.

У 1921 г. ў Мінску адкрываецца Беларускі дзяржаўны універсітэт. І тут вельмі спатрэбіўся талент У. М. Ігнатоўскага, прычым і як наркома народнай асветы — трэба было вырашаць безліч пытанняў (кадравых, арганізацыйных, навуковых, метадычных і г. д.) і як вучонага, педагога (вышэй мы гаварылі аб тым, што ён быў вядомым выкладчыкам, прафесарам настаўніцкага, а пасля педагагічнага інстытута). У. М. Ігнатоўскі з галавой акунаецца ў універсітэцкія праблемы. Ён — таленавіты прафесар, член Савета, дэкан факультэта грамадскіх і педагагічных навук.

Займаючы адказныя пасты, У. М. Ігнатоўскі шмат зрабіў для ажыццяўлення палітыкі беларусізацыі. Ён стаяў ля яе вытокаў, быў адным з натхняльнікаў беларускага адраджэння.

У 1922 г. ў Мінску быў створаны Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт). Інбелкульт прадстаўляў сабой вышэйшую

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзяржаўную навуковую ўстанову на Беларусі. З моманту арганізацыі Інбелкульта (1922 г.) да студзеня 1925 г. яго старшынёй з'яўляўся вядомы навуковец С. М. Некрашэвіч. Інстытут уваходзіў у склад наркамата асветы. Са студзеня 1925 г. начале Інбелкульта стаў У. М. Ігнатоўскі. У лютым 1926 г. ЦВК БССР прыняў рашэнне выдзеліць Інбелкульт са склада наркамата асветы, пераўтварыўшы яго ў самастойную ўстанову, падпарадкаваную непасрэдна Савету народных камісараў БССР. Гэтай жа пастановай старшыня Прэзідыума Інбелкульта У. М. Ігнатоўскі па яго просьбе быў вызвалены ад пасады народнага камісара асветы і засяродзіў усю ўвагу на працы ў Інбелкульце.

У. М. Ігнатоўскі ў 20-я гг. прыкладаў вялікія намаганні, каб аб'яднаць для плённай навуковай працы ў Інбелкульце і вышэйшых навучальных установах розных па палітычных поглядах людзей, у тым ліку і тых, хто вярнуўся ў сярэдзіне 20-х гг. на Беларусь з эміграцыі. Сярод іх былі і актыўныя дзеячы Рады Беларускай Народнай Рэспублікі В. У. Ластоўскі, А. І. Цвікевіч, А. А. Смоліч і інш. Многія высокакваліфікаваныя вучоныя, у тым ліку з так званай старой прафесуры, прыехалі з Украіны, РСФСР і іншых месц.

К канцу 1928 г. Інбелкульт ператварыўся ў даволі моцную навукова-даследчую ўстанову. Да працы ў Інстытуце былі прыцягнуты лепшыя навуковыя сілы рэспублікі. Адладжваліся сувязі Інбелкульта з навуковымі ўстановамі СССР і іншых саюзных рэспублік.

Улічваючы, што Інбелкульт па характару і аб'ёму сваёй працы і тых задачах, якія стаялі перад ім у той час, ужо наблізіўся да навуковай установы Акадэміі навук, ЦВК і СНК БССР у кастрычніку 1928 г. прынялі рашэнне аб яго рэарганізацыі ў Акадэмію навук. Гэта рашэнне было ўхвалена на пасяджэнні саюзнага ўрада (СНК СССР).

У снежаньскім 1928 г. нумары часопіса «Бальшавік Беларусі» У. М. Ігнатоўскі аргументаваў рэарганізацыю Інбелкульта ў Акадэмію навук настуным чынам: «У мэтах выкарыстання навуковых дасягненняў для сацыялістычнага будаўніцтва Істытут беларускай культуры разгарнуў шы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рокую працу. У Інбелкульце згрупаваліся лепшыя навуковыя сілы, і ён пачаў абрастаць кадрамі маладых даследчыкаў. Наладзіліся навуковыя сувязі з навуковымі ўстановамі СССР і замежных дзяржаў. Усе гэта прывяло як партыйную, так і беспартыйную грамадскасць да прызнання своечасовасці рэарганізацыі Інстытута беларускай культуры ў Беларускую акадэмію навук».

Прэзідэнтам Беларускай акадэміі навук быў прызначаны У. М. Ігнатоўскі. Адначасова ён быў дырэктарам Інстытута гісторыі акадэміі навук. Функцыяніраваць акадэмія пачала з 1 студзеня 1929 г.

Асобная размова аб яго разнастайнай грамадскай, палітычнай, дзяржаўнай дзейнасці. У 1920 г. ён быў членам Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта БССР; кароткі час у 1920—1921 гг. — народны камісар земляробства, з 1921 па 1926 г. — народны камісар асветы БССР. Ён займаў шэраг пасад у кіраўніцтве Кампартыі (бальшавікоў) Беларусі. У 1923—1924 гг. ён — кандыдат у члены, у 1924—1930 гг. — член ЦК КП(б)Б, у 1925—1930 гг. — член бюро ЦК КП(б)Б. Выбіраўся ён і ў кіруючыя савецкія органы. У 1925—1927 гг. яго выбіраюць членам Цэнтральнага выканаўчага камітэта СССР, у 1920—1930 гг. — членам Цэнтральнага выканаўчага камітэта БССР, а ў 1924—1930 гг. — і членам Прэзідыума Цэнтральнага выканаўчага камітэта БССР.

Нажаль, гэты таленавіты чалавек, так многа зрабіўшы для свайго народа, як і шэраг іншых прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі, быў абвінавачаны ў нацыянальна-ухілісцкай дзейнасці. У канцы 1930 г. У. М. Ігнатоўскі быў выведзены з членаў бюро і з членаў ЦК КП(б)Б, вызвалены ад пасады прэзідэнта Акадэміі навук, у студзені 1931 г. яго выключаюць з партыі, а ў пачатку лютага 1931 г. ён быў выкліканы на допыт у ДПУ

Будучы магутным чалавекам, усведамляючы сваю невіноўнасць, ён знайшоў лепшым пайсці з жыцця, чым быць нявінна праследуемым. Пасля допыту ў ДПУ 4 лютага 1931 г. у доме У. М. Ігнатоўскага раздаўся выстрал, абарваўшы яго жыццё. Ніхто не даведаецца аб тым, пра што думаў у той момант гэты магутны чалавек. Можна меркаваць, што пе-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рад яго вачыма паўстала яго радзіма, якую ён марыў бачыць шчаслівай сярод сясцер-рэспублік, якая будуе «новае жыццё на зусім новым грунце» (Кароткі нарыс... С. 30).

З гэтага часу і аж да 1990 г. імя знакамітага вучонага замоўвалася, працы яго не друкаваліся. Светлае імя Усевалада Макаравіча вярнулася да нас толькі ў 1990 г., калі рашэннем ЦК КПБ ён пасмяротна быў адноўлены ў партыі, рэабілітаваны палітычна. А праз год, у 110-ю гадавіну з дня нараджэння, у Акадэміі навук Беларусі прайшлі навуковыя чытанні, адбылася навуковая канферэнцыя ў Брэсцкім педагагічным інстытуце, было ажыццёўлена пятае (першае пасля смерці аўтара) выданне яго «Кароткага нарыса гісторыі Беларусі». На будынку былога Інбелкульта ў знак ушанавання памяці аб вучоным устаноўлена мемарыяльная дошка.

* * *

Ідзе час, мяняецца аблічча краіны, мяняюцца сацыяльна-культурныя стасункі жыцця. Але застаецца гістарычная памяць. У. М. Ігнатоўскі — адзін з тых, памяць аб кім будзе жыць у вяках. Ён пакінуў нам багатую спадчыну. Многія яго працы актуальны, запатрабаваны і сёння. Аб гэтым помняць удзячныя нашчадкі, сведчаннем таму — святкаванне 125-й гадавіны з дня яго нараджэння.

У рамках святкавання 125-й гадавіны з дня нараджэння У. М. Ігнатоўскага 19—20 красавіка 2006 г. упершыню на Камянеччыне прайшлі навукова-асветніцкія чытанні, якія сталіся значнай падзеяй, унікальным мерапрыемствам не толькі для Камянеччыны. Яны атрымалі ўхваленне з боку навукоўцаў і асветнікаў. Гэтая падзея шырока асвятлялася ў прэсе і на беларускім радыё. Раённая газета «Навіны Камянеччыны» дала змястоўны рэпартаж, абласная грамадска-палітычная газета «Народная трыбуна» змясціла кароткае паведамленне, газета «Наша слова» — орган таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны надрукавала цікавы артыкул І. А. Жатко «З пашанай да Ігнатоўскага».

У чацвёртым нумары часопіса «Беларуская думка» за 2007 г. надрукаваны артыкул Святланы Істратавай і Ганны Свячко «З марамі пра свой горад».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Чытанні адбыліся, дзякуючы намаганням Камянецкага раённага Савета дэпутатаў і асабіста старшыні Ніны Данілаўны Стасюк, раённага выканаўчага камітэта (старшыня Сцяпан Рыгоравіч Радкавец), Агародніцкага сельсавета (малая радзіма У. М. Ігнатоўскага) (старшыня Барыс Аляксандравіч Данілюк), эліт-клуба «Імя», якім кіруе ініцыятыўны руплівец Лілія Цімафееўна Іванова (гэта ёй належыць ідэя правядзення чытанняў, якая была падтрымана ў раёне на самым высокім узроўні), ініцыятыўнай групы аб'яднання «Моладзь. Навука. Грамадства» і асабіста кіраўніка ініцыятыўнай групы старшага выкладчыка Віцебскага дзяржаўнага універсітэта імя П. М. Машэрава Вольгі Паўлаўны Кошкінай, намесніка кіраўніка ініцыятыўнай групы, загадчыцы каардынацыйнага цэнтра Рэспубліканскага саюза грамадскіх аб'яднанняў «Беларускі камітэт маладзёжных арганізацый» Алены Віктараўны Кузмянковай.

Чытанні працягваліся два дні. У першы — усе дарогі, як сфармулявала думку Ніна Данілаўна, вялі ў запаведны куточак — вёску Такары, дзе 19 красавіка 1881 г. ў сям'і народнага настаўніка нарадзіўся Усевалад Макаравіч Ігнатоўскі. Менавіта гэтая зямля ўзгадавала, дала свету знакавую асобу — першага прэзідэнта Акадэміі навук Беларусі, першага наркома асветы рэспублікі, вучонага з вялікай літары, вядомага грамадскага дзеяча.

Адкрываючы свята ў Такарах, каля памятнага знака, куды прыехалі прадстаўнікі мясцовай улады, шаноўныя госці, удзячныя землякі, старшыня Агародніцкага сельсавета Барыс Аляксандравіч Данілюк пранікнёна гаварыў аб сваім земляку, які знаходзіўся ля вытокаў навукі і культуры рэспублікі, бясконца многа зрабіў для беларускага народа. Барыс Аляксандравіч гаварыў таксама пра тое, з якой пашанай, энтузіязмам людзі ўзводзілі Памятны знак. У гэтай высакароднай справе ўдзельнічалі школьнікі, мясцовыя жыхары, пагранічнікі. Ён жа расказаў цэлую легенду аб камені мудрасці, прывезеным з блізкага ляска, які зараз узвышаецца побач з помнікам.

Кажуць, зусім верагодна, што ў свой час юны У. М. Ігнатоўскі, які часта хадзіў у бліжэйшую вёску, спыняўся тут,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сядзеў на магутным камені, складаў асабістыя планы і марыў аб будучыні роднай Беларусі. Таму і называецца гэты камень каменем мудрасці і ўваходзіць у ансамбль Памятнага знака.

Пранікнута павагай і ўдзячнасцю было выступленне ініцыятара чытанняў, кіраўніка эліт-клуба «Імя» Ліліі Цімафееўны Івановай, якая падкрэсліла веліч і значэнне для беларускай навукі і культуры асобы У. М. Ігнатоўскага.

У гэты дзень да Памятнага знака У. М. Ігнатоўскаму з любоўю і пашанай былі ўскладзены кветкі, а таксама была пасаджана памятная алея. У самы разгар свята адбылася сімвалічная з'ява — у небе закружыўся бусел. Ён рабіў круг за кругам вакол знакамітага месца. І ўсім падалося: то радуецца душа Усевалада Макаравіча за тую ўвагу, якую аддалі яго памяці ўдзячныя нашчадкі. Кіраўнік мясцовага сельскагаспадарчага прадпрыемства расказаў аб некаторых эпізодах з гісторыі вёскі Такары, аб той пашане, з якой адносяцца да славутага земляка працаўнікі, аб іх сённяшніх справах.

У другой палове дня ў Высокаўскай санаторнай школе-інтэрнаце адбылася першая частка непасрэдна чытанняў.

Вядучая паседжання загадчыца Каардынацыйнага цэнтра рэспубліканскага саюза грамадскіх аб'яднанняў «Беларускі камітэт маладзёжных арганізацый», адзін з ініцыятараў правядзення чытанняў Алена Віктараўна Кузьмянкова гаварыла аб нараджэнні ўнікальнага мерапрыемства, якое станецца адметнай з'явай у культурным жыцці.

Удзельнікаў чытанняў цёпла вітала старшыня раённага Савета дэпутатаў Ніна Данілаўна Стасюк. Яна пранікнёна гаварыла аб старажытнай Камянецкай зямлі, яе знакамітых ураджэнцах, сярод якіх яркай зоркай ззяе асоба У. М. Ігнатоўскага. Сярод слухачоў былі не толькі навукоўцы з розных куткоў краіны, але і шматлікія прадстаўнікі мясцовай культуры і адукацыі.

Навукова-асветніцкія чытанні працягваліся на другі дзень у Камянецкім гарадскім доме культуры. Удзельнікі навукова-асветніцкіх чытанняў прынялі зварот да навуковай грамадскасці, асабліва да маладых навукоўцаў — зрабіць правядзенне навукова-асветніцкіх чытанняў, прысвечаных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У. М. Ігнатоўскаму, навуковай традыцыяй, што будзе садзейнічать пераемнасці фундаментальных навуковых школ, створыць умовы для апрабацыі навуковых поглядаў маладых даследчыкаў; навуковыя традыцыі будуць садзейнічаць больш шырокаму распаўсюджванню навуковых поглядаў, працэсу росквіту грамадства ў цэлым.

Знакавай падзеяй гэтага дня стала ўрачыстае адкрыццё мемарыяльнай дошкі на будынку цэнтральнай раённай бібліятэкі, якой прысвоена імя У. М. Ігнатоўскага. З прамовамі выступілі прафесар П. Р. Ігнатовіч, старшыня Камянецкага райвыканкама С. Р. Радкавец, малады вучоны А. Я. Крапіўны, настаўнік гісторыі камянецкай гімназіі Я. У Антончык.

Удзельнікі навукова-асветніцкіх чытанняў выказваюць глыбокую падзяку ўсім арганізатарам святкавання і прадстаўнікам мясцовых органаў, якія прынялі актыўны ўдзел ва ўшанаванні памяці У. М. Ігнатоўскага. Мы выказваем асабістую падзяку старшыні раённага Савета дэпутатаў Ніне Данілаўне Стасюк, старшыні Камянецкага райвыканкама Сцяпану Рыгоравічу Радкаўцу, кіраўніку эліт-клуба «Імя» Ліліі Цімафееўне Івановай, загадчыку аддзела адукацыі райвыканкама Віктару Мікалаевічу Грыцуку, загадчыку аддзела культуры райвыканкама Мікалаю Канстанцінавічу Громіку, дырэктару Камянецкай раённай цэнтральнай бібліятэкі Ніне Астапаўне Нікіцюк, старшыні Агародніцкага сельсавета Барысу Аляксандравічу Данілюку, дырэктару ААТ «Александрыя-Агра» Алегу Георгіевічу Казакевічу, дырэктару ААТ «Макарава-Агра» Валерыю Іванавічу Казаўчуку, дырэктару ААТ «Відамлянскае» Міхаілу Мікалаевічу Страпко, дырэктару Высокаўскай санаторнай школы-інтэрната Валянціне Уладзіміраўне Дэнека, дырэктару Высокаўскага каледжа Юрыю Іванавічу Сахарчуку, індывідуальнаму прадпрымальніку Віктару Уладзіміравічу Рыбакону.

У даным зборніку змешчаны матэрыялы першых навукова-асветніцкіх чытанняў, прысвечаных 125-й гадавіне з дня нараджэння У. М. Ігнатоўскага, праведзеных на яго радзіме.

Сярод іх ёсць артыкулы, у якіх аналізуецца жыццёвы шлях самаго У. М. Ігнатоўскага, яго ўклад у станаўленне на-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вукі і культуры краіны, сённяшняе сацыяльна-культурнае жыццё Камянеччыны, матэрыялы аб іншых ураджэнцах гэтага самабытнага кутка беларускай зямлі. Іншыя артыкулы тычацца шырокай палітры разнастайных праблем, якія даследуюцца навукоўцамі — удзельнікамі чытанняў.

## ЧТО В ИМЕНИ ТВОЕМ...

***Иванова Л. Т.***

*Нам не дано предугадать,*
*Как наше имя отзовется.*

Ф. Тютчев

Сто двадцать пять лет прошло с тех пор, когда в селе Токари, что рядом с г. Высокое, родился этот человек. Но до сих пор имя В. М. Игнатовского вызывает далеко не однозначные мнения даже у его коллег. И это замечательно, ибо чем более знаменито имя, тем менее разгадано оно потомками, поскольку существует незримая, но вполне реальная связь имени человека с его судьбой, с его способностью достигать тех или иных высот в жизни.

Каждое имя несет в себе определенный запас энергии. Это как некий «проявитель» неограниченных возможностей, дремлющих в человеке. Чем сильнее запас имени, тем больше оно будет проявлено, тем полнее, многостороннее самореализуется личность.

Многие отечественные и зарубежные ученые уже давно подметили влияние имени на судьбу и характер человека. Исследовано, что каждое имя несет в себе информацию о способностях человека, о его наклонностях уже с раннего детства: какую профессию лучше выбрать, каким видом деятельности он может заняться, в какой области может достичь высот и т. д.

Имя — это отличительный, самодостаточный знак, определяющий индивидуальность. Надо лишь произнести имя, чтобы человек точно знал, о ком идет речь. Есть некая неис-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ